# Рэкі атрымалі адзнакі "добра" і "выдатна": як Беларусь, Украіна і Расія клапоцяцца пра трансгранічныя водныя аб'екты

**На Гомельшчыне самыя вялікія запасы паверхневых вод у Беларусі Як захоўваецца гэтае багацце, расказаў намеснік начальніка аддзела кантролю за аховай і выкарыстаннем атмасфернага паветра і водных рэсурсаў Гомельскага абласнога камітэта прыродных рэсурсау і аховы навакольнага асяроддзя Вадзім ТКАЧОЎ, імя якога занесена на Дошку гонару Мінпрыроды.**

—За кошт выкарыстання ў вытворчасці сістэм абаротнага і паўторнага водазабеспячэння ўдаецца дасягнуць сур'ёзнага ўзроўню эканоміі паверхневых вод. Пры гэтым эканомія вады складае больш за 95 %,— кажа Вадзім Ткачоў — На некаторых прадпрыемствах і арганізацыях складанае становішча, аднак, нягледзячы на недахоп фінансавых сродкаў, праца па рэканструкцыі і будаўніцтве аб'ектаў па ачыстцы сцёкавых вод не спыняецца. У Рагачове працягваецца рэалізацыя праекта па будаўніцтве новых ачышчальных збудаванняў за кошт крэдытных сродкаў Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця. Ёсць ужо завершаныя праекты. Напрыклад, на Беларускім металургічным заводзе ў гэтым годзе ўведзены ў эксплуатацыю ачышчальныя збудаванні па перапрацоўцы засоленых сцёкавых вод. Гэта значыць, забяспечана вяртанне на паўторнае выкарыстанне 600 кубічных метраў у суткі сцёкавых вод, якія раней ішлі на ачышчальныя збудаванні КЖУП «Унiком». Неўзабаве гэта абсталяванне выйдзе на поўную магутнасць. На Тураўскім малочным камбінаце завершана будаўніцтва ачышчальных збудаванняў поўнай біялагічнай ачысткі.

**— Прырода не ведае межаў: Дняпро бярэ пачатак у Расіі і, працякаючы па тэрыторыі Беларусі, нясе свае воды ва Украіну. Ці не стварае трансгранічны статус гэтай воднай артэрыі праблем з забруджваннем рэк Гомельшчыны?**

У вобласці размешчана 29 пунктаў назірання, у тым ліку два трансгранічныя пасты на вадацёках, якія прыходзяць у Беларусь з тэрыторыі Расіі (рэкі Іпуць у Добрушы і Бесядзь у Свяцілавічах Веткаўскага раёна). Назіраннямі ахоплена 17 рэк, адно вадасховішча. Штогод адбіраецца каля 300 проб і выконваецца звыш 8000 хімічных аналізаў. Як паказваюць вынікі маніторынгу паверхневых вод, большасць водных аб'ектаў вобласці па гідрахімічным і гідрабіялагічным статусе адносяцца да катэгорыі «добры» і «выдатны».

За два апошнія гады прыкметна палепшыўся агульны стан водных аб'ектаў басейнаў Дняпра, у прыватнасці па складзе біягенных элементаў.

**— Гэтым летам у Гомелі адбылося першае пасяджэнне Прыпяцкага басейнавага савета. Якія пытанні абмяркоўваліся і хто ўзяў удзел у яго рабоце?**

Адно з вострых і цікавых пытанняў, якое абмяркоўвалася на пасяджэнні, — прамэтазгоднасць аднаўлення воднатранспартнага злучэння Е-40. Прадстаўнік Міністэрства транспарту і камунікацый праінфармаваў аб бягучым стане спраў. Удзельнікі пасяджэння асабліва адзначылі, што работы па гэтым праекце павінны ажыццяўляцца ў строгай адпаведнасці з патрабаваннямі водаахоўнага заканадаўства нашай краіны. Разгледзелі і шэраг арганізацыйных пытанняў, абраўшы кіраўніцтва Прыпяцкага басейнавага савета. Хачу падкрэсліць, што на пасяджэнне білі запрошаны прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў «Багна» і мясцовая “Асацыяцыя дзяцей і моладзі”. Намеснік старшыні ГА «Багна» Канстанцін Чыкалаў расказаў пра дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў па кіраванні воднымі рэсурсамі ў басейне ракі Прыпяць.

У далейшым басейнаваму савету трэба будзе правесці самы пільны аналіз існуючай водагаспадарчай сітуацыі, а таксама даць аб'ектыўную ацэнку

перспектыўнаму выкарыстанню водных рэсурсаў з улікам сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі.

**— Як наладжана супрацоўніцтва з калегамі з суседніх краін?**

З калегамі з Расіі і Украіны ў нас склаліся добрыя працоўныя кантакты і добрасуседскія адносіны. У мінулым годзе разам з расійскімі спецыялістамі спецыялістамі актывізавалі працу па трансгранічным маніторынгу вод у басейнах рэк Дняпро і Заходняя Дзвіна.

У маі Гомель прымаў удзельнікаў X пасяджэння сумеснай беларуска-расійскай камісіі па ахове і рацыянальным выкарыстанні трансгранічных водных аб'ектаў. Па выніках пасяджэння было адзначана, што у цэлым водагаспадарчая абстаноўка на трансгранічных водных аб'ектах басейнаў Дняпра і Заходняй Дзвіны застаецца стабільнай.

У рамках I Форуму рэгіёнаў Веларусі і Украіны, які праходзіў 25—26 кастрычніка ў Гомелі на базе абласнога камітэта адбылося пасяджэнне Дняпроўскага басейнавага савета. На ім разгледзелі шэраг актуальных пытанняў, у прыватнасці праект плана кіравання басейнам ракі Дняпро, меры па прадухіленні заморных з'яу рыбы.

Аксана ЯНОЎСКАЯ

**Источник:** Звязда. – 2018. – 30 кастрычніка (№ 209). – С. 8.